УДК 373.51

**Т.М. Лагуценкава**
(Бялынічы, Беларусь)

# МЕДЫЯАДУКАЦЫЯ І МЕДЫЯКАМПЕТЭНТНАСЦЬ ЯК ВАЖНЫЯ СКЛАДНІКІ ВЫКЛАДАННЯ ГУМАНІТАРНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ XXI СТАГОДДЗЯ

*XXI стагоддзе – гэта эпоха інфармацыі, якая ператварылася ў глабальны рэсурс чалавецтва. Сродкі масавай інфармацыі даўно ўжо сталі сродкамі масавай камунікацыі, а інфармацыйная прастора стала сусветнай і глабальнай. Узніклі такія паняцці як медыяадукацыя, медыякампетэнтнасць і медыякультура. Сёння гэтыя тэрміны выкарыстоўваюцца ўсімі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу.*

У слоўніку тэрмінаў па медыяадукацыі тлумачэнне медыяадукацыі падаецца як "працэс развіцця асобы з дапамогай сродкаў масавай камунікацыі (медыя) і на іх матэрыяле з мэтай фарміравання культуры зносін з медыя, творчых, камунікатыўных здольнасцей, крытычнага мыслення, уменняў паўнавартаснага ўспрымання, інтэрпрэтацыі, аналізу і ацэнкі медыятэкстаў, навучання розным формам самавыяўлення пры дапамозе медыятэхнікі" [4, с. 64].

Медыяінфармацыйная граматнасць (медыякампетэнтнасць) – "гэта сукупнасць навыкаў і ўменняў, якія дазваляюць людзям аналізаваць, крытычна ацэньваць інфармацыю і ствараць уласныя медыятэксты ў розных відах медыя, жанрах



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і формах. Такім чынам, медыяадукацыя і медыяінфармацыйная граматнасць суадносяцца як працэс і вынік адпаведнай адукацыйнай практыкі" [2, с. 5]. Медыяграматнасць можна фарміраваць на любым школьным прадмеце. Але больш высокі медыяадукацыйны патэнцыял маюць мова і літаратура, замежная мова, гісторыя, музыка, біялогія, фізіка, матэматыка, інфарматыка.

"Медыякультура – гэта сукупнасць інфармацыйна-камунікацыйных сродкаў, матэрыяльных і інтэлектуальных каштоўнасцей, якія выпрацаваны чалавецтвам у працэсе культурна-гістарычнага развіцця і спрыяюць фарміраванню грамадскай свядомасці і сацыялізацыі асобы. Медыякультура ўключае ў сябе культуру перадачы інфармацыі, культуру яе ўспрымання і можа выступаць сістэмай узроўняў развіцця асобы, здольнай успрымаць, аналізаваць, ацэньваць медыятэкст, займацца медыятворчасцю, засвойваць новыя веды ў галіне медыя" [3, с. 32].

Задача сучаснага педагога – навучыць сваіх вучняў думаць крытычна, бо інфармацыйная прастора і новыя тэхналогіі, якія хутка мяняюцца, удасканальваюцца, патрабуюць ад сучасных вучняў новых ведаў і ўменняў, якія яны павінны прымяняць у інфарматызаваным грамадстве. Сучасны школьнік павінен удумліва аналізаваць новую інфармацыю, ацэньваць яе і адбіраць карысную для сябе. Ён павінен умець разглядаць новыя ідэі з розных бакоў і розных пунктаў погляду, рабіць высновы наконт дакладнасці і каштоўнасці атрыманай інфармацыі, а таксама разумець, як розныя віды інфармацыі суадносяцца паміж сабой, аспрэчваць тую інфармацыю, якая не мае дачынення да справы ці з'яўляецца недакладнай, і згодна з гэтым прымаць рашэнні.

Сістэматычнае і паслядоўнае ўключэнне медыяадукацыі ва ўсе ўзроўні сістэмы адукацыі – гэта патрабаванне часу. Але працаваць на медыйную кампетэнтнасць не так проста, бо медыяпісьменнасць вучняў фарміруецца на падставе многіх прынцыпаў. І гэтымі прынцыпамі павінны кіравацца настаўнікі ў сваёй дзейнасці. М. Запрудскі вылучае пяць прынцыпаў, якія ляглі ў аснову кампетэнтнаснага падыходу пры фарміраванні медыяпісьменнасці вучняў:

1. Мадэльнае ўяўленне аб выпускніку. Неабходным кампанентам мадэлі выпускніка павінна быць яго медыяграматнасць.

2. Пашыранае разуменне зместу адукацыі. Гэта, па меркаванні М. Запрудскага, не толькі прадметныя ўменні і веды, але і ключавыя кампетэнцыі, у склад якіх уваходзяць многія аспекты медыяпісьменнасці.

3. Праектаванне дзейнасці па фарміраванні кампетэнцый. Вызначэнне вучэбных задач-сітуацый, у працэсе вырашэння якіх фарміруюцца адпаведныя медыйныя кампетэнцыі, веды і ўменні.

4. Увядзенне ў адукацыйны працэс задач-сітуацый, якія ствараюць умовы для фарміравання і развіцця розных кампетэнцый.

5. Аналіз і ацэнка паспяховасці фарміравання кампетэнцый.

Акрамя кампетэнтнаснага падыходу пры фарміраванні медыяпісьменнасці трэба ўлічваць асаблівасці метадаў і сродкаў, якія рэкамендуецца прымяняць. Яны павінны быць інтэрактыўнымі і даваць магчымасць вучням уключацца ў стасункі з настаўнікам, сродкамі масавай інфармацыі і аднакласнікамі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Для ацэнкі медыйнай выніковасці ўрока можна прымяняць розныя сродкі. Напрыклад, пытанні настаўніка вучням ці пытанні вучняў настаўніку адносна стаўлення да інфармацыі, да розных яе крыніц; заданні па пошуку патрэбнай інфармацыі ў інтэрнэце; стварэнне сітуацыі выбару; узаемаацэнка вучнямі выкананых заданняў па акрэсленых крытэрыях; стварэнне вучнямі невялікіх медыятэкстаў і размяшчэнне іх у школьнай газеце; заданняў і сродкаў можа быць многа, але галоўная іх задача – выклікаць зацікаўленасць, абудзіць жаданне да навучання і набыцця новых ведаў і кампетэнцый.

Такім чынам, уключэнне медыякультуры, медыяадукацыі ва ўсе ўзроўні сучаснай адукацыі – гэта патрэба часу. А валоданне метадамі і сродкамі яе фарміравання дапамагае настаўніку фарміраваць у вучняў крытычны погляд на падзеі, мяняць пункт гледжання на звычайныя аб’екты, трэніруе ўменне прапаноўваць большую колькасць ідэй у межах дадзенай тэмы, усімі магчымымі спосабамі развівае здольнасць да самаадукацыі, вучыць быць паспяховым.

**Спіс літаратуры**

1. Медыяадукацыя ў сучаснай школе: зборнік навукова-метадычных артыкулаў / Т. Ваврава [і інш.]. – Мінск, 2016. – 91 с.

2. Палейка, А.А. Вызначэнне базавых паняццяў, прынцыпаў і падыходаў да фарміравання медыяінфармацыйнай граматнасці ў сярэдняй школе / А.А. Палейка // Народная асвета. – 2016. – № 3. – С. 5.

3. Радзевіч, А.У. Мэты, задачы і сродкі развіцця медыякультуры вучняў ва ўрочнай і пазаўрочнай дзейнасці / А.У. Радзевіч // Народная асвета. – 2016. – № 3. – С. 32.

4. Федоров, А. В. Словарь терминов по медиаобразованию, медиапедагогике, медиаграмотности / А. В. Федоров. – Таганрог : Изд-во Таганрог. гос. пед. ин-та, 2010. – 64 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова